ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

'91

ЧАЦВЕР
23
МАЯ
№ 14(1678)

ЧЫРВОНЫ РАДОК

Калі вас раптам будуць пераконваць, што кіраўніцтва універсітэта не клапоціцца аб здароўі сваіх супрацоўнікаў, давядзіце да ведама апанента загад рэктара «Аб устаўленні даплат супрацоўнікам за шкодныя ўмовы працы». Ім прадугледжаны дванаццаціпрацэнтныя надбаўкі да зарплаты прыбіральшчыцам — за ўборку памяшканняў, дзе вядзецца рамонт, аператарам хімводаачысткі, якія праводзяць работы па хларыраванню вады з прыгатаваннем дэзынфіцыруючых растворaў, электрагазазваршчыкам, што займаюцца газазварачнымі работамі ў памяшканнях.

* * *

Адразу тры новыя падраздзяленні з'явіліся на біялагічным факультэце: праблемная навукова-даследчая лабараторыя гідраэкалогіі з асноўным навуковым напрамкам — вывучэнне кругазвароту рэчываў і патокаў энергіі як асновы біялагічнага самаачышчэння і фарміравання якасці вод; НДЛ малекулярнай генетыкі, якая будзе займацца даследаваннем генетычнай рэгуляцыі біяхімічных працэсаў клеткі, і НДЛ генетыкі фітапатагенных бактэрый. Асноўная задача апошняй недасведчанаму чалавеку, відаць, здасца даволі незразумелай — даследаванне малекулярна-генетычных механізмаў узаемаадносін патаген — расліна і аналіз геномаў фітапаталагічных раслін.

* * *

Якімі здадуцца два месяцы знаходжання ў Мінску супрацоўніка універсітэта горада Камагуэя (Куба) Роберта Мільета Луасеса, загадзя сказаць цяжка. Спадзяёмся, эканамічныя праблемы, якія ліхаманяць сёння рэспубліку, не перашкодзяць яму ў абмене вопытам навуковай работы з універсітэцкімі калегамі.



20-га... 23... 29 мая. Вось і чэрвень. Але гэта не лета пакуль. На студэнтаў яно зірне ласкавым сонечным вокам толькі пасля апошняга экзамену ў сесіі. Трывайце, сябры! Зусім крышачку засталося...

МІНІ-РЭПАРТАЖ АБ КЛАСІКАХ

ШУКАЙЦЕ ЗОРАК НА ЖУРФАКУ

17 траўня на журфаку ішла «вечарына журфакаўскіх класікаў», на якой аматары роднай культуры, не пазбаўленыя выканаўчых талентаў, сабраліся, каб адвесці душу ля крынічкі мастацтва. Рыпела апаратура, звінелі гітары, ляцелі ў паветра вершы — усё ішло, як мае быць. Колькасць гледачоў не песціла вока.

Сабраныя разам, зоркі журфака ўяўлялі сабой нядрэннае відовішча. Вечар пачаў з гітарай у руках Валера Пазнякевіч, студэнт другога курса філфака, да таго ж вылучаны, як высветлілася, кандыдатам у народныя дэпутаты раённага Савета. За ім спяваў Алесь Палынскі, які працуе ў «Чырвонай змене». Між выступленнямі спевакоў сцэнай уладарыў Уладзімір Пучынскі, малады і шматабяцаючы паэт.

За А. Палынскім гітары ў рукі ўзялі (адну адразу паклалі з-за няспраўнасці) хлопцы славутай у межах факультэта ўх-групы «Б.Б.», загадкавую назву гэтым часам яны тлумачылі як «Беларуская банда», хоць нядаўна быў «Бэбі блюз». Хлопцы ў рэкордна малым складзе: Ягор Хрусталёў, Аляксандры Несцераў і Цімашэнка — спявалі на дзіва беларускую песню «А ёй бы толькі семак палушчыць», у якой быў добра схоплены матыў вёскі і вераломнасць жаночай натуры. Песні былі на ўзроўні.

Следам свае фельетоны чытаў Алег Зайцаў. Нечакана з'явіўся Сяргей Лаўнік, прыехаў з Гародні — нібы з карабля на баль — і спяваў на ўласныя вершы.

Нельга абысці ўвагай дэбют Юрася Драздова, які нечакана і бліскуча выканаў дзве песні.

На фінішы ўх-група запэўніла, што са сцэны не пойдзе, пакуль хоць адзін інструмент будзе граць, і стварыла меладычную какафонію, вытокі якой да сённяшняга дня — таямніца.

Шкада, што вечарына мела надзвычай лакальныя памеры. Выканаўцы ўвасаблялі лепшыя журфакаўскія якасці: раскаванасць, сцэнічны вопыт, немалую долю артыстызму... Не хапала толькі гледачоў. Калі вы цярпліва пераварылі гэты рэпартаж аб норавах на вечарах журфака, вам засталося пабачыць усё сваімі вачыма. Прыходзьце наступным разам, каб не згасла свята журфакаўскіх класікаў.

Н. ЖУК.

ГРОШЫ НА СТОЛ!

За ўсё заплочана?

На той дзень, калі я звярнулася са сваёй просьбай у прыёмную камісію (17 мая), у правазнаўцаў стос заяў быў ужо даволі ўнушальны, 115 чалавек марылі завочна набыць другую спецыяльнасць, нягледзячы на тое, што плата за вучобу значна ўзрасла.

Калі раней прэтэндэнт на другі «вышэйшы» дыплом плаціў за год навучання ў БДУ 600 рублёў, незалежна ад таго, якую спецыяльнасць ён набывае, то зараз такса ўзрасла і больш нагадвае цэнік у камерцыйным магазіне: на гуманітарныя спецыяльнасці ўзнос складае 1100 рублёў, на прыродазнаўчыя — 1300.

Але, як бачыце, прагных да навукі нельга спужаць нават такімі высокімі цэнамі. Толькі закрадваецца сумненне: ці сапраўды пойдуць да нас самыя прагныя і зацікаўленыя, а не тыя, каму грошай няма куды дзяваць? Будзем спадзявацца на лепшае.

Дарэчы, у прыёмнай камісіі мне паведамілі, што пры залічэнні, у прыватнасці, на юрыдычны факультэт, у першую чаргу стануць студэнтамі (незважаючы на тое, што «прахадная» сума для ўсіх аднолькавая) тыя, хто мае дыплом з адзнакай, так званыя льготнікі (воіны-афганцы, інваліды) і ваеннаслужачыя, звольненыя з радоў Савецкай Арміі ў сувязі са скарачэннем штатаў. Толькі пасля іх — усе астатнія. Між іншым, некаторым давядзецца паспрабаваць «прарвацца» на другі год — план залічэння на правазнаўства роўна 100 чалавек. І не больш.

Апошнім часам кандыдату тэхнічных навук, загадчыку аддзела НДІ ЯП М. Г. Ліўшыцу даводзіцца даволі часта ўдзельнічаць у розных прадстаўнічых канферэнцыях. Не так даўно ён быў запрошаны дакладчыкам на Міжнародную канферэнцыю ў ЗША, потым — семінар у Нью-Йоркскім універсітэце. Зараз — Раўбічы.

Чым жа заваяваў фізік-ядзершчык права выступаць з такіх высокіх трыбун?

Сёння наша жыццё немагчыма ўявіць без лазераў, бо яны даўно ўжо з поспехам выкарыстоўваюцца ў самай мірнай галіне — медыцыне.

Апошнія дзесяць гадоў назіраецца сапраўдны бум у вынаходніцтве цвёрдацельных лазераў (на шкле, гранаце, рубіне). Яны былі ў цэнтры даследаванняў

У НАВУКОВАЙ ЛАБАРАТОРЫІ

Другое нараджэнне

вучоных ЗША, Японіі, Канады. У нашай краіне таксама некалькі інстытутаў займаюцца гэтай праблемай.

— Але мы адзіныя,— з гонарам гаворыць Марк Гілераві ч,— хто атрымаў генерацыю на фасфарыце з хромам і стварыў першую навуковую мадэль цвёрдацельнага лазера.

Для недасведчаных тлумачу, чым адрозніваецца наш лазер ад раней існуючага і ў чым яго перавага.

У тых лазерах, з якімі мы прывыклі працаваць, быў адзін недахоп — даўжыня хвалі ў іх не перастройвалася. Мы не маглі рэгуляваць яе так, як нам захочацца. Стварэнне лазераў на фасфарыце з хромам адкрыла такую магчымасць. Сумяшчаючы абодва крышталі ў адзінай мадэлі, мы можам перастройваць даўжыню хвалі ў бачным і бліжнім інфрачырвоным дыяпазоне ад 0,4 да 1,3 мікрона. Між іншым, у чэрвені ў Мюнхене пройдзе IX Міжнародны кангрэс-кірмаш, дзе мы мяркуем выставіць свой лазер і разлічваем на цікавыя прапановы замежных фірм.

Дзе можа выкарыстоўвацца распрацоўка?

У светлаводных лініях сувязі, таму што даўжыня хвалі можа супадаць з максімальнай празрыстасцю светлаводаў. Для даследавання забруджанасці атмасферы, у ваеннай прамысловасці. Лазер будзе цікавы і ў навуковай лабараторыі для правядзення даследаванняў у галіне хіміі, біялогіі, спектраскапіі металаў. Безумоўна, адна з асноўных сфер выкарыстання лазера — медыцына, у праватнасці, мікрахірургія. Менавіта аб гэтым у першую чаргу думалі вучоныя інстытута, ствараючы новую мадэль лазера.

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

АДГУКНІСЯ, ПАКУПНІК!

Для чаго існуюць кнігі? Вядома, каб іх чытаць. Аднак калі выданне па той ці іншай прычыне састарэла ў кнігасховішчы, то, відаць, у гэтым ёсць пэўная доля віны работнікаў бібліятэкі.

Яны не раз думалі аб тым, як дапамагчы кнізе знайсці свайго чытача. Аднак шматлікія ўмоўнасці часта перашкаджаюць зрабіць тое, што хочаш, і прымушаюць чакаць дазволу «зверху».

Нарэшце, ён быў атрыманы. Спачатку Міністэрства культуры СССР і Дзяржкамітэт СССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю зацвердзілі «Палажэнне аб парадку арганізацыі продажу насельніцтву кніг, іншых твораў друку і матэрыялаў з бібліятэчных фондаў». Потым на аснове гэтага дакумента — загад рэктара. Ён і стварыў камісію, якая займалася падборам і ацэнкай кніг.

Усяго паспрабуюць вырвацца з цёмных падвалаў кнігасховішчаў каля 2000 выданняў (каля 700 назваў).

— Сярод прапануемых намі для продажу кніг ёсць і даволі цікавыя, — гаворыць загадчыца аддзела абменнага фонду Л. У. Дубок.— У любой бібліятэцы ёсць літаратура, якая па той ці іншай прычыне не карыстаецца попытам: ці тое яна не адпавядае профілю чытацкай аўдыторыі, ці сабралася вялікая колькасць аднаго і таго ж найменняў. Спачатку мы абавязкова прапануем яе іншым бібліятэкам рэспублікі і краіны. Але калі не атрымліваем заяўкі, то незапатрабаваная літаратура падлягае продажу.

Наўрад ці ўдасца работнікам бібліятэкі рэалізаваць усе выданні, але калі пашанцуе, то выручаная сума складзе амаль 3000 рублёў. Куды пойдуць гэтыя грошы?

Згодна з палажэннем, 60 працэнтаў — на папаўненне бібліятэчных фондаў і 40 — на заахвочванне супрацоўнікаў бібліятэкі, якія актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі кніг, а таксама тых, хто мае высокія паказчыкі ў рабоце.

ЗАПАМІНАЙЦЕ: першы продаж літаратуры ўніверсальнай тэматыкі з абменнага фонду адбудзецца 23—24 мая з 12 да 17 гадзін у памяшканні бібліятэкі (галоўны корпус, 2-гі паверх).

Тут знойдзецца што выбраць і набыць матэматыкам, фізікам, філолагам, гісторыкам, геаграфам... І, скажу па сакрэту, у асноўным уся літаратура будзе прадавацца па старых цэнах.

ЗВАРОТ

СТАРШЫНЯЎ ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ ВНУ

Мы, старшыні прафсаюзных камітэтаў Беларускага політэхнічнага інстытута, Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі, Беларускага тэхналагічнага інстытута, Магілёўскага дзяржаўнага педінстытута імя Куляшова, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны, Брэсцкага політэхнічнага інстытута, Мінскага радыётэхнічнага інстытута, Віцебскага педінстытута, Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, Гродзенскага універсітэта, Мінскага дзяржаўнага педінстытута імя А. М. Горкага і Мінскага дзяржпедінстытута замежных моў на мяжы пераходу да рыначнай эканомікі, глыбока разумеючы ролю інтэлігенцыі ў развіцці грамадства, сваю асабістую адказнасць за наша будучае і будучае Беларусі, ведаючы вопыт развітых краін аб прыярытэтным развіцці народнай адукацыі, жадаючы аб'яднаць нашы намаганні па развіццю вышэйшай школы, аб'яўляем аб стварэнні Савета старшыняў прафкомаў ВНУ рэспублікі.

Асноўную задачу Савет бачыць у павароце работы прафсаюзных арганізацый ВНУ ад размеркавальных функцый да іх прамых абавязкаў: сацыяльна-эканамічнай абароне інтарэсаў супрацоўнікаў ВНУ.

Наша першачарговая задача — барацьба за прыярытэтнае развіццё вышэйшай школы.

1. Дабіцца асігнаванняў на развіццё народнай адукацыі не меней 10 працэнтаў велічыні нацыянальнага даходу, са штогадовым ростам гэтага паказчыка на 1—2 працэнты і вывядзеннем яго да 2000 года на ўзровень 20—30 працэнтаў, які адпавядае ўзроўню найбольш развітых краін.

2. Дабівацца выканання Праграмы пераходу Беларускай ССР да рынку, зацверджанай Вярхоўным Саветам БССР, аб забеспячэнні заработнай платы прафесарска-выкладчыцкаму саставу ў 1,5 разы вышэй у адносінах да заработнай платы ў прамысловасці.

3. Лічыць аб'екты будаўніцтва вышэйшай школы прыярытэтнымі, а аб'екты Гомельскай і Магілёўскай абласцей — часткай праграмы ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС.

4. Зыходзячы з крайне вострай жыллёвай праблемы, забяспечыць абавязковае выкананне Пастановы Савета Міністраў БССР № 199 ад 1987 года, распаўсюдзіўшы яго на ўсіх работнікаў вышэйшай школы.

5. Адкрыць у бліжэйшыя два — тры гады першы ў рэспубліцы спецыялізаваны санаторый для супрацоўнікаў вышэйшай школы.

6. Міністэрству народнай адукацыі БССР, БРК прафсаюза работнікаў народнай адукацыі распрацаваць да 1.09.91 г. новае палажэнне аб планаванні і аплаце працы прафесарска-выкладчыцкага саставу.

ПРАДУЗЯТЫЯ ЗАМЕТКІ

І заспявае па-англійску салавей...

«Гэта гадзіна, калі з галін нясецца высокая нота салаўя...» — спрабую перакласці першы радок цудоўнага верша Байрана «Змрок». У перакладзе атрымліваецца не так прыгожа. Так шкада, што я ведаю ў арыгінале толькі гэты верш славутага англічаніна. І ніколі не чытаю сябрам надвячоркам ні Шэкспіра, ні Бэрнса — іх твораў у англійскім варыянце таксама не ведаю. А сябры яшчэ ні разу не радавалі мяне Гётэ на нямецкай ці Рэмбо на французскай...

Для чаго людзі вывучаюць замежныя мовы? Калі не браць на ўлік студэнтаў адпаведных ВНУ і факультэтаў, астатніх паліглотаў можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп: тыя, каму мова неабходна ў прафесійных мэтах, тыя, хто збіраецца пакінуць нашу краіну назаўсёды, тыя, хто мае магчымасць ездзіць за мяжу, і — бадай, самая вялікая група — незадаволеныя ўзроўнем сваёй моўнай падрыхтоўкі наогул.

Вядома, выключныя выпадкі існуюць насуперак такой класіфікацыі. Але яны не перашкаджаюць зрабіць вывад аб тым, што нам замежныя мовы патрэбны не для таго, каб чытаць літаратурныя арыгіналы. Сённяшняе жыццё, наш час не спрыяюць такому захапленню. Рэчаіснасць «любіць» прадпраймальнікаў, бізнесменаў, камерсантаў, гідаў... Многія курсы працуюць менавіта для іх. Напрыклад, арганізаваныя пры Гандлёва-прамысловай палаце БССР. Замежныя мовы вывучаюцца тут з дзелавым ухілам. Кошт таксама «дзелавы»: 160 рублёў у год за «паступова-павольнае» вывучэнне, якое можа працягвацца ад года да трох, і 360 рублёў — за трохмесячнае, інтэнсіўнае.

Інтэнсіўныя методыкі сёння вельмі ў модзе. «Размоўны ўзровень ведаў англійскай, французскай і іспанскай мовы за 3 месяцы!», «За паўгода навучым размаўляць нават пачынаючых!», «Кароткатэрміновыя курсы з выкарыстаннем арыгінальнай методыкі!» — абяцаюць і заклікаюць шматлікія аб'явы. І стаяць яны ў тым самым шэрагу разнастайных пазык ЦУДУ, якія так і валяцца на нас з усіх бакоў. Прычым карыстаюцца вялікім попытам! Цудаў хочуць усе. І аддаюць вялікія грошы з наіўнай упэўненасцю, што за тры месяцы авалодаюць структурай незнаёмай мовы, асновамі яе граматыкі і шырокім колам лексікі.

Трохмесячныя курсы адкрыліся насустрач няспыннаму попыту нават пры Інстытуце замежных моў. Праўда, тут дзейнічае разумная дыферэнцыяцыя: ёсць групы для пачынаючых, ёсць і для тых, хто мае ўжо пэўны ўзровень ведання мовы; ёсць кошт для дарослых навучэнцаў (236 рублёў) і для школьнікаў — палова гэтай сумы.

Выпускнік такіх і падобных ім курсаў можа смела ехаць у замежную турыстычную паездку. Вітацца, развітвацца, задаваць распаўсюджаныя пытанні, размаўляць па тэлефоне, рабіць пакупкі і звяртацца да афіцыянта ў рэстаране яго навучылі. Што да сапраўдных чалавечых зносін, то лепш не пытайцеся ў знаёмых, якія вярнуліся «адтуль», пра тэмы іх размоў з замежнымі сябрамі. Калі вы чакаеце пераказу гутарак аб творах мастацтва той краіны ці агульначалавечых каштоўнасцях, вас засмяюць. І таму, што савецкія грамадзяне імкнуцца за мяжу не за гэтым. І таму, што пасля вяртання будуць хаваць за смехам над вамі, недасведчанымі, свой сорам за ўзровень ведання мовы.

Нягледзячы на гэта, нам ўсё роўна не патрэбны пакуль курсы замежных моў, якія дапамогуць пазнаёміцца яшчэ і з культурай данай краіны, і з гісторыяй яе, няхай сабе і ў агульным плане. Не атрымліваем мы такія веды ў сярэдняй школе, праходзяць яны міма нас у ВНУ, няма калі (і навошта?) займацца самаадукацыяй і ніяк не паспець за некалькі месяцаў на курсах...

А калі за некалькі гадоў? Курсы англійскай і нямецкай моў, якія дзейнічаюць пры Мінскім Доме афіцэраў, разлічаны на двухгадовы тэрмін навучання. У абавязковай праграме — тэксты аб краіне і яе сталіцы, некалькі вершаў самых славутых нацыянальных паэтаў. Наўрад ці гэтага дастаткова — так сабе, тое-сёе. Да таго ж, выпускнікі даных курсаў менш валодаюць размоўным узроўнем мовы, чым тыя, хто аддае перавагу «інтэнсіўным». Але ў іх ёсць яшчэ адна перавага — курсы пры Доме афіцэраў, бадай, самыя танныя ў Мінску: увесь двухгадовы тэрмін навучання каштуе 288 рублёў (да нядаўняга падаражання — у два разы менш).

Між тым, спрачацца наконт пераваг тых ці іншых курсаў — справа дарэмная. Выбар сапраўды ёсць. Вывучайце, калі ласка! Хочаце сам-насам з прыватным выкладчыкам — плаціце 15 рублёў у гадзіну. Можна паспрабаваць і завочную форму — даслаць дакументы ў Кіеў ці Маскву і рэгулярна атрымліваць метадычныя дапаможнікі, гукавыя матэрыялы і праверяныя ўласныя кантрольныя работы. А можна... наогул абысціся без усялякіх курсаў, калі вы — студэнт. Святлана Васільеўна Лузгіна, загадчыца кафедры англійскай мовы для прыродазнаўчых факультэтаў, аргументавана запэўніць вас, што пры жаданні і старанні вы можаце добра вывучыць мову БЯСПЛАТНА. На большасці факультэтаў БДУ, акрамя абавязковых заняткаў, працуюць факультатывы паглыбленага вывучэння замежных моў. На іх прымаюцца тыя, хто мае неблагі школьны падмурак, а з іх выпускаюцца — дастойныя канкурэнты тым, каму веданне замежнай мовы каштавала некалькі соцен рублёў.

Але ж такая наша псіхалогія — патрабуе яна для любой працы моцнага стымулу. Вы згодны? Тады выкарыстоўвайце шанц, які дае, зноў жа, універсітэт. Стымул сапраўды важкі: 210 рублёў ці, на выбар, 480. Першай сумай вы заахвоціце сваю мару з дапамогай курсаў «Ванда», якія арганізаваны Малай гасразліковай фірмай «Сервіс універсум», а амаль што пяццю сотнямі — дзякуючы кааператыўнаму вучэбна-метадычнаму цэнтру «Паліглот». Чарговыя наборы ў групы пачнуцца з пачатку новага навучальнага года. Значная перавага ўніверсітэцкіх курсаў перад іншымі ў Мінску — маленькія вучэбныя групы (не больш 12 чалавек). Гарантуецца таксама высокая кваліфікацыя выкладчыкаў і родныя сцены «альма матэр».

Раптам вы нават пачнеце чытаць літаратуру народаў свету ў арыгінале? Такі вынік варты самай значнай сумы. Але такіх гарантый ніводныя курсы вам не дадуць. Нарэшце, вы самі можаце навучыцца чытаць, калі маеце пачатковае веданне мовы: пакрысе, са слоўнікам... Калі маеце ўпэўненасць, што вам і каму-небудзь яшчэ гэта патрэбна. За мяжу вы, магчыма, паедзеце хутка. А дзе ж тыя часы, калі людзі пачнуць чытаць адзін аднаму вершы, па чарзе — рускіх і італьянскіх, англійскіх і іспанскіх, нямецкіх і французскіх аўтараў на арыгінальных мовах. Цудоўныя будуць часы! Будуць цудоўныя часы?

В. БЯГУН.

SOS! SOS! SOS!

У палоне наркаманіі

Апошнім часам колькасць аматараў «пабалдзець» значна павялічылася. Толькі ў мінулым годзе органамі ўнутраных спраў і аховы здароўя выяўлена і пастаўлена на ўлік за ўжыванне наркотыкаў 85 чалавек. Безумоўна, іх колькасць была б намнога меншай, калі б некаторыя людзі дзеля ўласнай нажывы не спрыялі гэтаму.

Як сведчыць афіцыйная статыстыка, адной з прычын росту наркаманіі ў рэспубліцы з'яўляецца наяўнасць легкадаступнай сыравіннай базы. Асноўны зыходны матэрыял для вырабу «злога зелля» — макавая саломка, з якой асобы, што ўжываюць наркотыкі, рыхтуюць экстракт опію. Як правіла, у палоне наркатычных сродкаў аказваецца моладзь, якая дрэнна ўяўляе тую небяспеку для ўласнага здароўя, якую нясе ўжыванне наркатычных сродкаў. Да таго ж, маладыя наркаманы нярэдка з-за адсутнасці грошай для набыцця наркотыкаў учыняюць злачынствы. За мінулы год толькі ў Мінску за «сувязь» з наркотыкамі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 60 чалавек, у тым ліку за іх продаж адбываюць працяглыя тэрміны пакарання 16 чалавек, дзе прадугледжана крымінальная адказнасць да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Яшчэ ў 1987 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прыняў Указ аб забароне пасеваў каноплі і мака. На жаль, ёсць такія людзі, якім усё, як кажуць, да лямпачкі. Яны працягваюць займацца сваёй чорнай справай у сельскай мясцовасці, гараджане — на ўласных дачах. А між іншым, Упраўленне Унутраных Спраў Мінгарвыканкома папярэджвае: за незаконны пасеў і вырошчванне каноплі і маку ў адпаведнасці з артыкулам 100 Крымінальнага кодэксу БССР аб адміністрацыйных парушэннях прадугледжаны штраф да 100 рублёў.

Убаку ад шумлівых дарог

Традыцыйны турыстычны злёт адбыўся як мае быць: ва ўстаноўленым месцы, у даўно запланаваны, як потым высветлілася, для многіх вельмі зручны час, па адладжанаму сцэнарыю, з галоўнымі і другараднымі дзеючымі асобамі. Я не маю магчымасці параўноўваць гэты злёт з мінулагоднім, а выказванні ўдзельнікаў і гасцей амаль аднолькавыя: з цягам часу нешта страчваецца, губляецца ўпэўненасць, што наступныя злёты выправяць становішча. Прагучала і жартаўлівая прапанова, што зручней было б правадзіць злёт турыстаў у актавай зале, а палаткі разбіваць у аўдыторыях. Магчыма, большая масавасць была б тады забяспечана.

Галоўнымі асобамі злёту павінны быць студэнты-турысты. Народ, безумоўна, энергічны, рухавы, але напярэдадні залікаў і экзаменаў амаль безыніцыятыўны. Толькі тым тлумачыцца, што ў спаборніцтвах прынялі ўдзел лічаныя факультэты універсітэта (юрыдычны, біялагічны, геаграфічны, ФПМІ і радыёфізічны).

ЦЯГНЕМ — НЕ ПАЦЯГНЕМ

Палаткі няспешна рассейваюцца на ўскрайку леса вакол невялічкага ўзвышэння з зялёнай травой. Толькі бабуля, здаецца, выпадкова апынулася тут з маленькім статкам зацікаўленых коз, але хутка знікла і больш не з'яўлялася.

Турысты тым часам ужо пачалі хварэць за свае каманды, якія ўдзельнічалі ў перацягванні канату. «Раз, два — і ўсё...» — хваліліся студэнты з факультэта прыкладной матэматыкі — пераможцы гэтай гульні.

ПРА АДНУ САПРАЎДНУЮ ПЕРАШКОДУ

Перашкоды ўчыняліся ўмоўна. «Небяспечная зона!» — словы камандзіра тургрупы юрфака ўспрымаюцца безагаворачна, і ўсе пачынаюць хутка рыхтавацца да пераадолення бездані пераправы. А далей трэба рухацца па лесе, прытрымліваючыся паказальнікаў, якія, дарэчы, прыводзяць да сапраўднай дрыгвы. Вузенькая кладачка, а далей — ніводнай купінкі. Некалькі метраў брыдзем па калена ў вадзе. І даволі хутка. Гразевыя пырскі ляцелі далёка, а іншыя дык і наогул не адляталі, заставаліся на адзенні і дапамагалі потым беспамылкова пазнаваць удзельнікаў паласы перашкод.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ АБ ДРОБЯЗЯХ

Намазаны гарчыцай хлеб непаслухмяна круціцца перад тварам настойлівага студэнта , які імкнецца ўхапіць хоць невялікі яго кавалачак, каб перадаць гумарыстычную эстафету наступнаму, каму наканавана кулем каціцца ў цёмным мяху на горку, каб потым даць магчымасць іншаму стрэліць з пнеўматычнай вінтоўкі, паспрабаваўшы пацэліць з мехам на галаве. Усё гэта пасля. А спачатку трэба цярпліва, з поўнай міскай вады на спіне, прапаўзці немалую дыстанцыю, выгінаючыся быццам вусень.

P. S. Першае месца заняў юрыдычны факультэт, другое — геаграфічны, трэцяе — за факультэтам прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Каманды атрымалі грашовыя прэміі (500, 250, 150 рублёў), якія, дарэчы, паменшыліся, пакуль даехалі да Вязынкі.

С. АЗАРЭВІЧ,
Т. КОЗАК.

ЧЫТАЛІ?

«Вяртанне» Шэрлака Холмса

Крыху звыш стагоддзя пасля выхаду ў свет першага апавядання сэра Артура Конан-Дойла пра Шэрлака Холмса у Лондане і, зразумела, на Бэйкер-Стрыт, у доме нумар 221Б адкрыўся новы музей, прысвечаны славутаму літаратурнаму герою.

Да апошняга часу паклоннікі Шэрлака Холмса з розных краін прыходзілі на славутую Бэйкер-Стрыт у дарэмных пошуках якіх-небудзь прыкмет існавання свайго героя. Будынак, апісаны ў Конан-Дойла, на самай справе даўно займае другое буйнейшае ў Брытаніі будаўнічае таварыства па прадастаўленню іпатэчных пазык — «Эбі Нэншл». Яно пакуль быццам бы не выяўляла ніякіх сведчанняў знаходжання ў ім у былыя часы ні Шэрлака Холмса, ні яго сябра доктара Уотсана, ні іх эканомкі місіс Хадсан.

Аднак зараз гэты ўзведзены ў XIX стагоддзі будынак рэстаўрыраваны, і «паліцэйскі» ў форме 100-гадовай даўнасці вітае наведвальнікаў ля ўваходу ў новы музей. Інтэр'ер чатырох пакояў адноўлены дакладна па апісанню ў апавяданнях Конан-Дойла. У ліку экспанатаў — памятныя рэчы самога Шэрлака Холмса і доктара Уотсана, рэчы, якімі карысталіся ў штодзённым жыцці і працы.

У доме можна ўбачыць вельмі рэалістычную фігуру місіс Хадсан, якая занята сваімі справамі, але самога Шэрлака Холмса няма нідзе. Наведвальнікі, аднак, могуць пачуць яго голас або — бліжэйшае набліжэнне да голаса славутага персанажа: у музеі ёсць старая грамафонная пласцінка з запісам голаса акцёра, які іграў Холмса. У запісу гучыць развітальная прамова, звернутая да Уотсана і місіс Хадсан напярэдадні пераезду ў вёску на поўдні Англіі.

Заснавальнік і дырэктар музея — Джон Эйдзініанц, вялікі прыхільнік твораў Конан-Дойла. «Музей абавязаны сваім існаваннем настойлівасці і рашучасці тысяч людзей, якія захапляюцца Шэрлакам Холмсам — яны хацелі, каб было аддадзена належнае памяці іх героя,— гаворыць Джон. — Мы ўпэўнены, што ў гасцях у нас пабывае каля 70 000 брытанцаў і замежных турыстаў у год. Нават сёння на Бэйкер-Стрыт 221Б працягвае прыходзіць незлічоны паток лістоў. Слава гэтага вялікага сышчыка даўно пераўзышла славу самога Конан-Дойла».

Музей плануе ўстанавіць бронзавую скульптуру Холмса брытанскага скульптара Сінсента Батлера ў паўночнай частцы Бэйкер-Стрыт, недалёка ад дома нумар 221Б. На гэты праект абавязаліся даць ахвяраванні як прыватныя асобы, так і розныя арганізацыі, у іх ліку таварыства «Эбі Нэншл» і выдаўцы кніг пра Шэрлака Холмса.

Характар гэтага персанажа, як гавораць, быў створаны па вобразу Джона Бэла, шатландскага ўрача, вядомага сваёй дакладнай дыягностыкай. Адзін з літаратурных крытыкаў таго часу пісаў: «Верагодна, ні адзін літаратурны персанаж не станавіўся яшчэ настолькі рэальным для чытачоў».

Шэрлак Холмс, безумоўна, — самы вядомы ў свеце літаратурны персанаж сышчыка, і яго паўсюль лічаць адным з самых яскравых вобразаў у англійскай літаратуры. Гэтага дэтэктыва, які грае на скрыпцы,у паляўнічым шлеме з трубкай у роце, так часта малявалі, ігралі ў кіно і на сцэне, што яго пазнаюць ва ўсім свеце амаль так імгненна, як Чарлі Чапліна, напрыклад.

Холмс пачынаў сваё поўнае прыгод жыццё ў аповесці «Барвовы след» у 1887 годзе, і ўсе шматлікія наступныя гісторыі адбываліся з ім спачатку на старонках часопісаў, а пазней — кніг. Яго сябру доктару Уотсану — флегматычнаму чалавеку, які дзяліў з Холмсам пакоі на Бэйкер-Стрыт, дастаўся водбліск славы дзякуючы таму, што Уотсан ценню ішоў за сваім славутым настаўнікам у большасці апавяданняў.

Артур Конан-Дойл нарадзіўся ў 1859 годзе, у Эдзінбургу, у сяроднебуржуазнай сям'і і вучыўся ў прыватнай школе на паўночным захадзе Англіі. Ён атрымаў дыплом доктара медыцыны ў 1881 годзе і адкрыў сваю практыку, некалькі гадоў быў карабельным урачом. Аднак ён не дасягнуў асаблівых поспехаў у сваёй першай кар'еры. Пісаць ён пачаў не толькі дзеля задавальнення, але і для таго, каб папоўніць свае сціплыя даходы, і да 1891 года зарабляў так добра, што змог зусім адмовіцца ад медыцыны дзеля творчасці. Конан-Дойл быў двойчы жанаты, меў траіх дзяцей, у 1902 годзе атрымаў рыцарскае званне за сваю работу ў палявым шпіталі ў Паўднёвай Афрыцы.

Конан-Дойла ведаюць у першую чаргу як стваральніка Шэрлака Холмса, практычна забытыя многія яго гістарычныя раманы і кнігі аб спірытызму. Стомлены сваім персанажам-Холмсам, аўтар, аднак, вырашыў у 1893 годзе па кончыць з ім у апавяданні «Апошняя справа» — да жаху прыхільнікаў вялікага сышчыка, якія заведаліся, што іх герой разбіўся, зваліўшыся са скалы, у паядынку са сваім смяротным ворагам Марыярці. Але любоў і прыхільнасць публікі да свайго дэтэктыва былі такія вялікія, што Конан-Дойл быў вымушаны цудоўным чынам ажывіць яго амаль адразу ж, калі з'явілася ў свет апавяданне «Пусты дом».

Нават смерць самога аўтара ў 1930 годзе не прывяла да канца бліскучай кар'еры Шэрлака Холмса — многія пісьменнікі спрабавалі, часта пашыраючы абставіны, апісаныя ў арыгінале, ствараць новыя гісторыі з прыгодамі Шэрлака Холмса, тым самым не даючы памерці гэтай традыцыі.

Часопіс «АНГЛИЯ».

НА ЗДЫМКАХ: Артур Конан-Дойл;
а дзін з пакояў у доме нумар 221Б на Бэйкер-Стрыт.

ХОЧАШ — ПРАВЕРЦЕ

Падыдзі да міражу ўшчыльную

Сціплая аб'ява не адразу прыцягнула ўвагу дробным машынапісным шрыфтам: «У памяшканні службы быту адбудзецца конкурс псіхакадзіравання па метаду кіруемага медытатыўнага аўтатрэнінга Кандыбы». Далей пералічвайся шэраг заганаў, ад якіх быццам бы магло прыйсці пазбаўленне на працягу трох (!) заняткаў курсу. І, нарэшце, інтрыгуючая фраза: «З ліку слухачоў будзе зроблены адбор на курсы па падрыхтоўцы экстрасенсаў (5 дзён) і прафесіяналаў-экстрасенсаў (9 дзён).

Адчуваючы размах арганізатараў справы, я захацела пабачыць «курс» на ўласныя вочы. Першым сюрпрызам быў кошт трох заняткаў — 50 рублёў...

Магчыма, чытач не ведае, што такое псіхакадзіраванне ці медытатыўны аўтатрэнінг. Але, напэўна, усе чулі пра звычайны аўтатрэнінг, што падыходзіць для павольнага хатняга ўдасканалення. Яго патрабаванні простыя: сядзьце роўна, расслабцеся, засяродзьце ўвагу, выкарыстайце самаўнушэнне...»

На занятках вучылі іншаму варыянту аўтатрэнінга. Экстрасенс уводзіў людзей у «кодавы стан», падобны на транс, і, выкарыстоўваючы гіпноз, прасіў выканаць практыкаванні: убачыць унутраным зрокам колер, адчуць пах і г. д. Пад гіпнозам гэта атрымлівалася лёгка, калі не атрымлівалася — памылка ліквідавалася карэктыроўкай. Задачай слухачоў курсу было авалоданне «кодавым станам» — пры дапамозе запісаных і завучаных фраз-формул навучыцца ўваходзіць самастойна ў гэты «стан абвостранага адчування», калі магчыма аддаць загад арганізму, і ёсць шанц, што ён будзе выкананы.

Паралельна з навучаннем для жадаючых праводзіўся аздараўленчы сеанс. Экстрасенс знімаў цяжар у патыліцы, уздзейнічаючы на таго, хто стаяў перад ім. Жанчыну ён лячыў ад пераядання наступным чынам: «Ежа будзе пахнуць для вас газай цэлы месяц». Фраза гаварыла сама за сябе. Чалавеку сілком навязвалася праграма, па якой ён павінен быў дзейнічаць.

Такім чынам, навучанне і лячэнне, заснаваныя на гіпнозе. Ці правамерна гэта? Ці мэтазгодна ўмяшанне ў псіхіку, няхай нават са згоды чалавека? Ці магчыма дабіцца аздараўлення шляхам націску на псіхіку? Як прадбачыць вынікі?

Я не бяруся аспрэчваць медыцынскі аспект «курса псіхакадзіравання», хацела б сказаць аб маральных праблемах, звязаных з ім.

Кадзіраванне, гіпноз выкарыстоўваюцца для ўзмацнення ўразлівасці арганізму. Але гэтага можна дасягнуць з дапамогай звычайнага аўтатрэнінга, не падвяргаючы сябе рызыцы чужога ўмяшальніцтва за ўласныя грошы. Патрэбны толькі час і праца. Але нам хочацца цуда, хутка і без напругі. Верагодна, у гэтым прычына папулярнасці паранармальных школ, аб'яднанняў, курсаў, якія растуць, як грыбы пасля дажджу. Але трэба сказаць, што нерэальна вырашыць за кошт цудаў свае праблемы.

Другі этап «навучання» — падрыхтоўка экстрасенсаў. Магчыма, для гэтага патрэбна, каб чалавек падняўся да вызначанага ўзроўню ўразлівасці. Ці можна сур'ёзна паставіцца да фразы аб 5-дзённым тэрміне навучання экстрасенсорыцы? Нехта палічыць, што гэта рэальна. Але здаровы розум падказвае, што нават медыцынскую сястру за пяць дзён не падрыхтаваць. А вось экстрасенса, аказваецца, магчыма? Ну ці не бязглуздзіцца?

«Хто такі экстрасенс?» — спыталася я ў прадстаўніка гэтай экзатычнай прафесіі. Адказ быў лаканічным: «Гэта чалавек, які прымае энергіі космаса і перадае іх людзям». У энергіях я разбіралася слаба, таму прыйшла са сваім пытаннем да чалавека, які мае вопыт у экстрасенсорыцы,— Наталлі Антонаўны Пракаповіч.

Праз некалькі хвілін прадмет нашай гутаркі быў заклеймаваны. І тое, што на гэтым робяць грошы, было не самым жахлівым абвінавачваннем. Смех у маёй субяседніцы выклікалі настолькі экстранныя тэрміны навучання. Яшчэ горш атрымалася з «энергіямі», якія адносяцца пакуль што выключна да вобласці акультывізму. Як сказала Наталля Антонаўна, на такіх курсах ігнаруецца сістэма абароны для работы экстрасенса, значыць, нейкія жыццёва неабходныя маральныя прынцыпы, без якіх смяротна небяспечна падыходзіць да гэтай справы. Высветлілася, што да Наталлі Антонаўны прыходзілі людзі, якія займаліся па методыцы Кандыбы і атрымалі пасля гэтага складанасці з псіхікай. Трэба было аказваць дапамогу.

Чым больш я ўнікала ў перыпетыі тэмы, тым больш складана мне было зразумець, хто ж сярод усіх гэтых шматлікіх школ і сістэм праведна вучыць чамусьці карыснаму, сапраўды неабходнаму ў жыцці. Няма паміж імі згоды, ёсць толькі недавер да іншых «лаўцоў душ» — канкурэнтаў. Можна бачыць няўзброеным вокам, як водгукі тайных ведаў, што дайшлі з часоў знікшых культур, «выходзяць у народ» з падполля ў рукі дзялкоў.

Пасля візіту на «курс» я зразумела таксама, што паранармальных з'яў лепш не кранацца з цікаўнасці ці жадання разагнаць сум. У такія нетры людзі ідуць іншым шляхам, зразумела, не праз «курсы псіхакадзіравання». Я не супраць экстрасенсорыкі як вобласці чалавечых здольнасцей. Я супраць некаторых метадаў нетрадыцыйна-інтэнсіўнага яе навязвання. Людзям немагчыма забараніць што-небудзь. Але магчыма папярэдзіць бязвольнае падпарадкаванне гіпнатызёру, няхай сабе экстрасенсу, ці забіванне памяці «кодамі» на ўзроўні жывёльных рэфлексаў. Можна нават нагадаць, што псіхіка ў чалавека адна, і іншай ужо не будзе.

Чаму ж чалавек сам не можа стаць гаспадаром свайго развіцця? Яму ж зараз з усіх бакоў сцвярджаюць: «Слухай, ісціна ж У ТАБЕ». Трэба толькі павярнуцца ДА СЯБЕ і адчыніць ёй дарогу.

Н. ЖУК,
студэнтка
факультэта
журналістыкі.

ДЛЯ ШЯБЕ

ЧАГО ЖАДАЕЦЕ?

Кавы і бутэрбродаў!

Наўрад ці вы сустрэнеце ў Мінску яшчэ адно такое ж прыемнае месца, як бар «Галактыка», што займае сціплы левы фланг фабрыкі-кухні і закрыты ад галодных студэнцкіх позіркаў.

Гэта ўстанова на рэдкасць адпавядае свайму прызначэнню: тут вы не паабедаеце ў звыклым сэнсе гэтага слова, інакш, вам не сюды. Тут можна толькі перакусіць, бо падаюць толькі каву, гарбату, бутэрброды і марожанае (якое, дарэчы, вельмі смачнае і прыносіць найбольшы даход установе). Хоць, вядома, не падаюць, а прапануюць браць самім, дасягнуўшы галавы чаргі ў 6—7 чалавек, якая, здаецца, ніколі не знікае. Чарга бывае і большай. Але хвілін праз 10 вы — уладальнік кавы і бутэрброда, яшчэ праз 5 — марожанага. Потым садзіцеся за стойку бара, самую сапраўдную стойку, пакрытую мармуровымі плітамі, і цешыцеся. Лепей было б, зразумела, каб падбягаў афіцыянт ці, як яго там, здаецца гарсон: «Чаго жадаеце?» Але ці ў наш час марыць пра гэта? Кажуць, праходы вузкія, двум афіцыянтам не разміняцца.

А ў астатнім — усё добра: кава нядрэнная, бутэрброды таксама... Кошт, вядома, павышаны. Нягледзячы на гэта, кава нават патаннела: была 48 капеек, стала 42. «Сярэдні джэнтльменскі набор» — кава, два бутэрброды і марожанае — будзе каштаваць рамантыку, аматару перахапіць што-небудзь каля трох рублёў. Нармальна!

Інтэр'ер бара уяўляе сабой прыклад добрага густу і нетрадыцыйнай планіроўкі. Зверху на чырвоных металічных формах у стылі «Уся ўлада Саветам!» — ліхтары даволі мадэрнісцкага выгляду. І люстэркі амаль усюды: зверху, збоку, ззаду. Іх такая колькасць, што з любога месца ў бары можна ўбачыць сваё адлюстраванне, не паварочваючы галавы. Згадзіцеся, карысная асаблівасць для дам і самаўлюбёных маладых людзей.

Час работы — з 9.00 да 21.00, перапынак — з 15.00 да 16.00. Не любіце натоўпу людзей — прыходзьце да 12 гадзін.

А. ПУНІНСКІ,
студэнт факультэта журналістыкі.

КРЫЙ БОЖА!

Калі ваш калега захварэў СНІДам

Адну з самых дзейсных вучэбных праграм па СНІДу распрацаваў Эрл Рыхтэр, прэзідэнт кампаніі «Мадзіна мэньюфэкчурынг», што выпускае прамысловыя і аўтамабільныя кандыцыянеры паветра і атапляльнае абсталяванне. Штаб-кватэра фірмы знаходзіцца ў Рэйсіне, штат Вісконсін, а 27 філіялаў з 4500 работнікамі раскіданы па ўсёй Амерыцы. Гадзінную праграму павінны праслухаць усе супрацоўнікі, пачынаючы з дырэктара. Яна стала ўзорам для многіх іншых кампаній, школ, цэркваў і грамадскіх арганізацый. Акрамя таго, Рыхтэр стварыў «камаманду» спецыялістаў па ахове псіхічнага здароўя, удзельнікі якой па першаму патрабаванню накіроўваюцца на самалёце кампаніі ў любы пункт Злучаных Штатаў, дзе ў супрацоўнікаў «Мадзіны» ці членаў іх сем'яў узнікаюць цяжкасці, звязаныя са СНІДам.

Друкуем прыкладны збор правілаў для тых кампаній і супрацоўнікаў, таварышы па службе якіх хворыя на СНІД. Спіс складзены Білам Патэрсонам, які рэгулярна правядзіць семінары на даную тэму.

ПАЗІЦЫЯ КАМПАНІІ. Да супрацоўнікаў, у якіх выяўлены СНІД ці іншыя небяспечныя для жыцця захворванні, трэба ставіцца з увагай і павагай. Фірма павінна свабодна і адкрыта інфармаваць сваіх супрацоўнікаў аб праблемах СНІДа.

Супрацоўнікам, у якіх дыягнасціраваны СНІД ці другія пагражаючыя жыццю захворванні, павінна быць прадастаўлена магчымасць працаваць, пакуль яны ў стане выконваць свае абавязкі.

Тым, хто звяртаецца за псіхалагічнай ці ўрачэбнай дапамогай, павінна быць гарантавана поўная канфідэнцыяльнасць.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ. Фірма цалкам адказвае за санітарна-гігіенічную асвету. У сувязі з тым, што СНІД уяўляе сабой агульнанацыянальную праблему, фірма абавязана весці асветніцкую работу сярод сваіх служачых з мэтай ліквідаваць прадузятасць і неабгрунтаваны страх, звязаныя з гэтай хваробай.

САЦЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ. У адносінах медыцынскай страхоўкі, атрымання інваліднасці, страхавання жыцця і г. д. да СНІДу трэба адносіцца, як да любога іншага захворвання, якое пагражае жыццю.

ПРЫЁМ НА РАБОТУ. Пры найме на работу фірма не павінна праводзіць праверку на СНІД ці ўключаць у анкеты пытанні, звязаныя са СНІДам.

Фірма не павінна нікога падвяргаць дыскрымінацыі ў сувязі з сексуальнымі перавагамі, полам, узростам, расай ці рэлігійнымі поглядамі.

АСВЕТА. У кампаніі павінна быць шырокая праграма санітарна-гігіенічнай асветы. Камплект метадычных дапаможнікаў звычайна ўключае 23-мінутную відэаплёнку, брашуры для служачых і матэрыялы для падрыхтоўкі менеджэраў. Тыпічны занятак павінен складацца з кароткага выкладання пазіцыі фірмы па пытанню аб СНІДзе, абмеркавання таго, якім чынам перадаецца (і не перадаецца) захворванне, агляду сродкаў сацыяльнага забеспячэння супрацоўнікаў і навейшай інфармацыі аб СНІДзе.

Фірма павінна мець даведачныя матэрыялы з артыкуламі аб СНІДзе, а таксама інфармацыйныя лісткі, Праграмы дапамогі служачым (ПДС), якія выпускаюцца даведачнай бібліятэкай. Сярод публікацый трэба таксама мець брашуры на тэмы аховы здароўя і фізічнай падрыхтоўкі.

ДАПАМОЖНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ. У рамках ПДС ці з дапамогай спецыялізаваных устаноў супрацоўнікам, іх сем'ям і групам работнікаў павінна быць дадзена магчымасць атрымання індывідуальных, сямейных і групавых кансультацый.

Штатныя супрацоўнікі ПДС павінны мець поўны спіс устаноў і арганізацый, якія аказваюць дапамогу хворым СНІДам, і канфідэнцыяльна забяспечваць гэтай інфармацыяй супрацоўнікаў па першаму патрабаванню.

ГРУПЫ ДАПАМОГІ ХВОРЫМ НА СНІД. Сфера дзейнасці групы павінна ахопліваць шырокае кола пытанняў, уключаючы тлумачальную работу. Група збіраецца не менш аднаго раза ў месяц. У ёй павінны быць прадстаўлены розныя аддзелы фірмы, у тым ліку аддзел кадраў і знешніх сувязей, вытворчыя сектары і офісы.

Мэты добраахвотнай групы павінны ўключаць распрацоўку шырокай праграмы асветы, правядзення звязаных з гэтым мерапрыемстваў, збор прапаноў, аказанне дапамогі работадаўцам і арганізацыям у развіцці ўласных праграм па СНІДу і збор сродкаў для барацьбы з ім.

ОЙ, ЛЮСТЭРКА, АДКАЖЫ...

Дзяўчына спяшаецца на экзамен

Стоп. Не трэба спяшацца. Усім вядома, што ў такіх справах залішняя мітусня нават да смеху не прыводзіць. Пакуль яшчэ ёсць час, паглядзім на сябе ў люстэрка, зазірнём у шафу...

І АДРАЗУ ЁСЦЬ ДВА БАЛЫ

Знешняму выгляду часам мы надаём больш увагі напярэдадні спаткання, а на экзамен — у тым, што трапілася ў апошні момант на вочы. Часцей гэта спадніца з глыбокімі кішэнямі, пінжак фасону «а ля мяшок», сукенка са складкамі. Так, галоўнае, каб адзенне надзейна захоўвала набор дапаможных сродкаў: падручнікаў, сшыткаў, шпаргалак (ад маленькіх папярак у гармонік да «бомбаў»).

І ўсё ж сапраўдная студэнтка аб сваім адзенні да экзамена паклапоціцца загадзя. Нехта лічыць, што ў такі адказны момант яна павінна з'явіцца перад выкладчыкам не больш не менш, як у дзелавым касцюме — пінжак плюс спадніца (вядома якая). Строгі англійскі касцюм сапраўды вельмі зручны і заўсёды ў модзе, і ён можа зрабіць кожную непаўторнай, дастаткова зрабіць форцікі іншай формы ці ўпрыгожыць гузікамі. Дарэчы, звычайныя гузікі — апошняя навінка сучаснай моды. Іх можна прышываць у самых нечаканых месцах. Дзелавітасць, зразумела, вельмі карысная якасць, але не трэба забываць аб маладосці, настроі летняга надвор'я. Зручны і практычны, прыбліжаны да англійскага касцюм — пінжак і штаны — не трэба катэгарычна адхіляць.

Спачатку некалькі слоў пра тое, як пабудаваць свой адказ, каб зрабіць на выкладчыка адпаведнае ўражанне, калі, магчыма, нешта і не ўспомніш у адказны момант. Па-першае, трэба назваць літаратуру, якой вы карысталіся пры даследаванні пытання, потым, калі гэта неабходна, даць вызначэнне, далей зручна акрэсліць сутнасць праблемы; самае галоўнае ў гэты момант — успомніць словы выкладчыка з яго лекцыі. У канцы адказу, як звычайна, робяцца вывады, тлумачыцца асабістая пазіцыя. І трэба памятаць: у пачатку і ў канцы прамовы нас заўсёды слухаюць больш уважліва.

Колер адзення падсвядома ўплывае на агульнае ўражанне. Макс Люшэр, вядомы сацыёлаг і псіхіятр, дацэнт кафедры псіхатэрапіі швейцарскага антрапалагічнага інстытута вылучыў, напрыклад, дзеля сваіх псіхалагічных даследаванняў чатыры асноўныя і столькі ж дадатковых колераў. Сімволіка кожнага колеру ідзе каранямі ў вытокі гісторыі існавання чалавецтва. Напрыклад, ноч, сімвалам якой з'яўляецца сіні колер, здаўна несла чалавеку спакой, сон. Калі вы лічыце, што выкладчык вельмі эмацыянальны, то ваша адзенне блакітна-сіняга колеру павінна яго крыху супакоіць. Норму ўспрымання забяспечваюць таксама і зялёныя фарбы. Колер травы, лісця — сімвал засцярогі, затоенасці, мэтанакіраванасці, пастаянства поглядаў.

Сонца, яскравасць дня, які нараджаўся, выклікалі надзею. А без гэтага на экзамен і з'яўляцца не варта. Жоўты колер падахвочвае «глядзець уперад і спадзявацца».

Запатрабаванне «дзейнічаць і дамагацца поспеху» сімвалізуе чырвоны колер — афарбоўка кветак, пладоў. Ён адлюстроўвае волю, імкненне да авалодання ўсімі дабротамі навакольнага жыцця. Але з чырвоным колерам трэба быць надта асцярожным: калі выкладчык ужо будзе нечым раззлаваны, чырвань яго толькі яшчэ больш раздражніць.

Дарэчы, не імкніцеся апрануцца заўсёды ў чорную ці карычневую сукенку, каб падкрэсліць сваю стараннасць ці строгасць — чорны колер сімвалізуе адмаўленне яркіх фарбаў жыцця, дзейнічае на выкладчыка прыгнятальна.

Каб выглядаць прывабна, выбірайце сабе свае фарбы, але ж, вядома, усё залежыць ад самога выкладчыка, ад яго настрою, ад яго адносін да вас як да асобы.

НА ГУСТ І КОЛЕР...

Моладзь прываблівае камбінаванне ў адзенні: аднакаляровая тканіна і тканіна з малюнкам, спалучэнне клеткі з палоскай, тканін з малюнкамі кантрасных памераў.

Апошнім часам універсальнымі зрабіліся трыкатажныя вырабы. Арыгінальнае спалучэнне трыкатажнага швэдра грубай вязкі і лёгкай, паветранай спадніцы дазволіць кожнай студэнтцы адчуць сябе больш упэўнена. Калі ёсць магчымасць выбраць тканіну, трэба памятаць: яркі колер — паказчык звышупэўненасці, што выкладчык абавязкова расцэніць як выклік. Гэта можа дазволіць сабе добра падрыхтаваная студэнтка. Астатнім лепш спыніцца на адзенні натуральных тонаў (охра, балотны, блякла-аранжавы, колеры камянёў).

А калі ў шафе — старое, несамавітае адзенне, якое, акрамя жахлівых пачуццяў, нічога не выклікае? У гэтым выпадку трэба праявіць уласную фантазію і з густам выкарыстаць шалікі, вязаныя каўнерыкі, скураныя рамяні і бранзалеты. Фурнітура абнаўляе нават самую старую адзежу.

Правільна выбранае адзенне — частка поспеху на экзамене, што дае магчымасць студэнтцы адразу ж атрымаць... два балы. Каму недастаткова, мастак-мадэльер Маргарыта БЕЛАБРОВІК, перадае эстафету псіхолагу.

ЛАВІЦЕ ШАРУ

Нарэшце, падзялюся ўласным студэнцкім вопытам, які пакуль што надзейна засцерагае ад незадавальняючай адзнакі.

Напярэдадні заліку ці экзамену выходжу на паляванне на шару. Гэта маленькая касматая жывёліна з доўгім хвастом, за які яе вельмі зручна лавіць разгорнутай залікоўкай. Самы адказны момант — своечасова закрыць гэтую кніжачку і надзейна прыхаваць ад цікаўных вачэй. Шару лепш лавіць гуртам з 4—6 чалавек у вялікім паўпустым памяшканні, дзе яна заўсёды спрабуе забіцца ў кут. (Тут «інтэрнатаўцы» знаходзяцца ў больш спрыяльных умовах, чым мінчане). У аўдыторыі залікоўку павінен разгарнуць толькі выкладчык. І вось калі на яго не дзейнічае ні ваша адзенне, ні ўмела выкарыстаныя парады псіхолага, а адказ ужо пачынае псаваць агульны настрой, на дапамогу прыходзіць шара. Як яна дзейнічае на выкладчыка — сакрэт таямнічай жывёліны. А студэнтка, атрымаўшы залік ці адзнаку, адчувае сябе пераможцай. Як вы ўжо зразумелі, самае галоўнае тут — удалае начное паляванне.

А вось адна знаёмая студэнтка мае «шчаслівую» сукенку і лічыць, што ў кожнай дзяўчыны яна таксама абавязкова ёсць. У гэтым выпадку трэба метадам падбору вылічыць менавіта тую, што валодае чароўнымі якасцямі. Аднак гэтая парада мае шмат нязручнасцей. Па-першае, трэба шмат часу для вельмі небяспечнага эксперыменту на самой сабе. Па-другое, сукенка можа дзейнічаць неаднолькава (часцей так і бывае) на выкладчыка-мужчыну і выкладчыка-жанчыну. Вось таму прапануем апошнюю выратавальную палачку — шчырыя выказванні нашых выкладчыкаў. Раптам менавіта яны і дапамогуць.

САМ-НАСАМ З ВЫКЛАДЧЫКАМ

Што б там ні было, але экзаменатары на першы план вылучаюць веды, змястоўнасць адказаў, уменне паказаць свае здольнасці ў гутарцы. Але і ім прыемна, калі студэнтка апранута з густам, калі адзенне падкрэслівае яе індывідуальнасць, упэўненасць, важнасць і ўрачыстасць падзеі, якая адбываецца.

С. АЗАРЭВІЧ.
Т. КОЗАК.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВІПА імя Я. Коласа.

23 мая

Зак. 2065.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9. ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.